# У святле духоўнага сяброўства

**У Мінску прайшлі Дні духоўнай культуры Расіі і Беларусі. Мерапрыемствы адбыліся на галоўных культурных пляцоўках сталіцы. У Нацыянальным мастацкім музеі і Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі расійскія спецыялісты правялі майстар-класы, прысвечаныя рэстаўрацыі і кансервацыі кніжных помнікаў, музейных прадметаў і калекцый.**

У Нацыянальным гістарычным музеі пачала работу выстава «Святыні старажытнага Ноўгарада — святло, якое дайшло праз стагоддзі». А ў філармоніі адбыўся спектакль-канцэрт «Ван Гог. Лісты да брата», удзел у якім узялі народны артыст Расіі Яўгеній Міронаў і камерны ансамбль «Салісты Масквы» пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР і Расіі Юрыя Башмета.

Адной з цэнтральных падзей Дзён духоўнай культуры Расіі і Беларусі стала канферэнцыя, прысвечаная культурна-гістарычнаму і духоўнаму скарбу краін, якая адбылася ў Нацыянальным мемарыяльным комплексе «Храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню Айчыны нашай».

Урачыстае адкрыццё форуму адбылося ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. З прывітальным словам выступіў першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Грамада:

— Сёння мы знаходзімся ў знакавым для культуры нашай краіны месцы — Купалаўскім тэатры. Акрамя таго, сёлета мы адзначаем два важныя юбілеі: 140-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Таму сапраўды сённяшні канцэрт сімвалічны. Агульнасць гістарычных лёсаў, агульныя духоўныя і культурныя каштоўнасці — мяркую, менавіта гэта з'яўляецца самым моцным фундаментам у нашым сяброўстве.

У сваю чаргу намеснік міністра культуры Расійскай Федэрацыі Ала Манілава выказала падзяку Міністэрству культуры Беларусі:

— Вялікі дзякуй усёй камандзе міністэрства за неацэнную дапамогу ў бездакорнай арганізацыі нашых рознафарматных мерапрыемстваў і проста за тую цеплыню, якую мы на працягу гэтых двух дзён адчуваем сэрцам.

Фінальным акордам цырымоніі адкрыцця стаў канцэрт хору Стрэчанскага манастыра пад кіраўніцтвам дырыжора, заслужанага артыста Расіі Нікана Жылы.

**Арына КАРПОВІЧ.**